працяг

Рэдакцыя газеты “ВЫБАР”
22 кастрычніка 1996 г.

**Уладзімір Плешчанка – Мікола Плавінскі**

**М.П.** – Валодзя, а ўсёткі для лідараў сёньня цяжка. Цяпер народу, якога можна практычна назваць “народам”, мала. Правільна? Як можна “народам” называць людзей, якія не разумеюць, што такое народ? Яны сябе, нават, не суадносяць зь ім.

Яны проста звычайныя людзі, якія як усе хочуць есьці, працаваць, нешта атрымліваць і, каб крышачку спакайней было. Ім накакаць на тутэйшыя праблемы ды і на лідараў таксама… Яны ўсё гэта ня хочуць.

Гэтаму лідару новаму ня ўкласьці ім у галовы тыя ідэі, якія былі б зразумелыя ім. Зноў прыйдзецца прымушаць. Прымушаць так рабіць, як ён, гэты лідар хоча і невялікая частка тых, хто яго разумее. Сёньняшняму лідару, калі б ён быў, было б вельмі цяжка.

**Ул.П.** – Бачыш, цяжка – ня цяжка, а вось там Беленькі казаў: “Глядзіце, электарат адзін і той жа”. Мы стварылі шмат партый. А ўлады-то дэмакратычнай няма.

Людзі амбіцыі нейкія займелі, а ўмоваў жа няма для шматпартыйнасьці. Сёньня патрэбна прайсьці шлях, які прайшлі краіны Балтыі. Яны напачатку дамагліся самастойнасьці і асноў дэмакратыі, а потым ужо, на базе адзінага вось гэтага руху ўтварылася шмат партый.

Мы гэты перыяд не перажылі. Павінны былі б усе аб’яднацца супраць гэтай савецкай сістэмы, камуністычнай гісторыі. Але ж нічога не аб’ядналася. Наадварот, адбылося так, што разбіліся, разышліся па розных кватэрах. А як цяжка здарылася, дык усе прыбеглі на мітынг.

Прыйшлі ўсе, і лідары партый розных прыйшлі. А электарат-то прыйшоў стары, бо электарату сваяго яны не прывялі. У іх жа галасоў шмат было на выбарах. А прыйшоў элетарат, які практычна пачынаў вось гэты рух. І шкада, што ён не пашырыўся. А элетарат, які быў ад дэмакратычных партый, застаўся дома.

**М.П.** – Правільна. Атрымалася вельмі проста. Калі адкінуць БНФ, і то ня ўсіх, гэтыя партыі не працуюць са сваім электаратам. Тыя іх падтрымалі проста і больш нічога.

Партыі кажуць: “ – Вось, хлопцы, мы сялянская партыя. Мы робім вось гэтакую справу. І ў спалучэньні зь іншымі партыямі толькі і можам здабыць сябе хаця б якое паляпшэньне – палітычнае ці ў іншых накірунках”. Дык яны ж так ня кажуць.

А хлопцы падтрымалі іх і на гэтым скончылася. Быццам яны выбралі для сябе цацку-ляльку, як на выставе: “ – Вось гэтая прыгожая, калі не вазьму, дык хоць пагляджу, што гэта такое”.

Таму іх няма каму весьці. Бо ёсьць лідар і некалькі прыхільнікаў – там можа сотня, другая, трэцяя. Усё. Больш некага весьці. Я ўжо даўно зразумеў, што ўсёткі, хлопцы, зрухі ў пакутах нараджюцца. Патроху. Я толькі адно хачу пажадаць людзям маладым – каб пры сваім маладым жыцьці ў іх нейкі пэўны вынік быў.

Але адкуль яму, гэтаму выніку паўстаць? Хай Лукашэнка папрацуе яшчэ год, другі. Няхай гэты “народ” упадзе яшчэ глыбей на некалькі там узроўняў. Ня ведаю, куды мы там яшчэ падаем. І я скажу, толькі гэты фактар будзе ўплываць.

Цяпер газеты, на жаль, масы не чытаюць. Калі выпісваюць, дык нейкія “Віцьбічы” ці “Народнае слова”. А нашыя не чытаюць. Адкуль яны што могуць ведаць?

Адзін мне казаў: “ – Што толку, што яны пішуць?” А я яму: ” – Хоць самі сябе падтрымаем. У гэтым мы трымаемся, – я яму кажу, – дзякуючы таму, што ўжо набыткі

ёсьць”. І яны прыбаўляюцца з кожным годам. Хаця й маленькія, мізэрнымі адсоткамі, але прыбаўляюцца.

Калі я хадзіў да перабудовы па Віцебску – не было з кім па-беларуску паразмаўляць. Няма з кім. Няма! Ну, калі прыедуць пісьменьнікі або нехта яшчэ. На сустрэчах толькі і можна было. Ня тое, што яе не разумелі. Але яна ня модная была мова. Ды гэтая мова багацей за расійскую, напрыклад! Тым больш, што ведаю, што ім беларусы стваралі гэтую мову некалі. У Маскве стваралі пры цары Аляксеі Міхайлавічы першую літаратурную грамату. Пасьля яна разьвінулася ў самастойную.

Калі думаю пісаць, дык мне выбару больш у беларускай мове, чым у расійскай. У ёй багацьце адценьняў. Яна мова арыстакратычная. Але, калі яна не ад сэрца ідзе, яна непрыгожая. Бо гэты чалавек выдаўлівае зь сябе гэтыя словы. Так што, мову гэтую разумее народ, яна не растварылася. Але ўсёткі гэта ўсё ня модна. Як ня модны БНФ, як ня модныя і астатнія партыі, якіх большасьць ня ведае. А Лукашэнку ведаюць.

Калісьці перад выбарамі, калі Кебіч ужо абрыд, тады пад сьцягам апазіцыі ў выбарах першага прэзідэнта ён ужо падняўся. Бо ён гаварыў мовай гэтага свайго будучага электарату. Абяцаў ім залатыя горы – гэтых усіх перасажаць, хто махлюе, жыцьцё палепшыць ды іншае. І працягвае пакуль байкамі падтрымліваць гэтую масу. Гэтай масе ня трэба праўда.

Стала быць, той невялікай часцы, хай гэта будзе 20%, – дэмакратычнай, разумнай, мудрай, – трэба неяк вучыць усёткі астатніх. Дзе хто знаходзіцца. Кожны жыве сярод пэўнага асяроддзя. І падзеі далейшыя самі дапамогуць гэтаму працэсу, каб ён перарос у вынікі больш-меньш станоўчыя. Вось тады і будуць нейкія вынікі – калі людзі нешта зьведаюць. І калі падыйдзе патрэбная пара. А зараз, што зробіш, мы павінны згадзіцца з абставінамі, але рабіць сваю справу.

**Ул.П. –** Ну, дапусьцім, Вярхоўны Савет адчаіцца зьняць пытаньні рэферэндуму. І свой праект, і лукашэнкаўскі на аснове рашэньняў Канстытуцыйнага суду. Дай бог, каб так адбылося. Каб гэтай авантуры не было. Тады хай ён лезе на гэты кол, што сам сабе нацясаў. Бо новую Канстытуцыю прымаць на рэферэндуме нельга. У Расіі прымалі Канстытуцыю на рэферэндуме, хацеў Кучма на Украіне.

А гэтыя пытаньні пра сьмяротную кару, пра зямлю, пра сьвята – надуманыя. Гэта ня так ужо і важна. Выдумаў ён пустое. Грошы на паветра выкінуць. Людзям падабаецца, хай зь ім. А па Канстытуцыі Вярхоўны Савет павінен уперціся і адмовіць правядзеньне рэферэндума аб новай Канстытуцыі. Няхай Лукашэнка лезе за прававое поле, калі так яму хочацца. А мы ўдзельнічаць у гэтым не павінны.

**М.П. –** Валодзя, а я між іншым, лічу крышачку інакш. Няхай усё гэта будзе. Гэтая блытаніна для выбаршчыка. Ён як быў дагэтуль непераборлівы, так і застаўся.

Ён будзе проста сам па сябе. Ён жа гэтай Канстытуцыі не прачытаў і не прачытае. А калі тут такія пытаньні розныя, тут, бачыш, рэферэндум можа не набраць адсоткі. Вось у чым справа.

Я, напрыклад, рады таму, што зразумеў больш-меньш таго ж Шарэцкага. Не выкідайце зараз новых гэтых камуністаў. Ня трэба сёньня іх масавага бэшчаньня. У іх жа таксама атрымалася ня тое. Разумныя зь іх людзі ўбачылі, што наступае тое, што ў ніякія рамкі ня ўлазіць. Зразумелі. І ня толькі Калякін, а і ў Віцебску. Хоць і ўсе яны нараджэнцы таго ж ладу, які панаваў звыш 70-ці гадоў. Яны адтуль.

І частка ў іх высокіх мудрых людзей выйшлі ў апаненты Прэзідэнту. Няхай гэтая сіла дадаецца да таго супраціву дыктатуры. А БНФ застаецца БНФам. Няхай ён сваю справу робіць. Бо без нацыянальнага адраджэньня ў рэспубліцы нічога ня будзе. Я ўсім гэта кажу. “Вот, сперва экономические…”, – дурні. Гэтая праблема заўжды будзе стаяць перад народам. Бо інакш народу няма.

Узгадаем Ірландыю. Англія ніяк ня можа з гэтым справіцца. І ня справіцца ніколі. Мудрая Англія ня справіцца. Так што бяз гэтай праблемы не абыйдзешся. Нават, калі і будзе якая кроў, яна гэтым людзям будзе законным чынам. Тое, што яны з беларушчынай робяць – гэта не законна. Бо без нацыянальнай ідэі ня будзе і міру між народамі, якія насяляюць Беларусь. Існуе Беларусь – значыць яна павінна мець свой касьцяк, які павінен паважаць усё астатняе. А ў нас гэтага няма. І ня будзе.

Я гляджу, і павер'і праваслаўненькія выкарыстоўваюць. Як папы ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах? Падрыхтоўваюць. Прабачце, Бог – адно, а гэтыя сьвяшчэннаслужыцелі іншае. Яны хамавіта робяць. Выступляюць на сходах. Палітыканамі зрабіліся. Таму ж Філарэту ня трэба было сядзець ні там, ні там. Ён павінен на сваім месцы сядзець – царкоўным. Як і ўсе сьвятары. Але ж астатніх не запрашаюць.

А вось гэтае абрыдлае ўжо слова "славяне". Як славяне, значыць людзі. А я кажу: "– Што, чачэнцы ня людзі?" А гляньце, што ў Югаславіі робіцца. Самыя лютыя ворагі – славяне між сабой. Гэта трэба ўлічваць. Ці возьмем сваю гісторыю. Звычайныя войны: Масковія з Літоўскім княствам, з Рэччу Паспалітай. Бясконцыя войны. Якая ж там "дружба"? І гэта славяне. Гэты лозунг збіты, а людзі, якія мала ведаюць, вераць. Пагэтаму людзі на зямлі ўсе роўныя.

Я вельмі паважаю, напрыклад, яўрэйства. Я жыў зь імі ў Віцебску. Сябраваў. Яны за тысячу гадоў падыйшлі к свайму "я", даказаўшы, што яны ёсьць, існуюць, і моцна існуюць. А ў нас усё пад нагамі, усё вакол сваё. Ды нас яшчэ ніхто і не выганяў. А мы сябе не шануем як нацыю. Гэта крыўдна. Але трэба прайсьці гэтае.

Бачыш, цікавае ў жыцьці што? Гэты шлях цікавы. Асабліва, калі ты малады. Ці ж гэта цікава, калі малады чалавек прапівае сваё жыцьцё? Ён ня бачыць акрамя бутэлькі, ці акрамя "баб" сэнсу. Вось як раз у нас беларусаў і ёсьць магчымасьць пажыць яшчэ, з музыкай прайсьці сваё жыцьцё, дапамагаць Бацькаўшчыне. Дапамагаць, хто чым можа. Павінен дапамагаць. І малы, і стары.

---

Прысутнічаў, запісваў і апрацоўваў Юрай Касіч.